ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 9 (96)



# УСЕ ЗАДАЧЫ ВЫКАНАНЫ



**Сумеснае аператыўнае вучэнне «Шчыт Саюза — 2019» праходзіла з 13 да 19 верасня на палігоне паблізу населенага пункта Муліна Ніжагародскай вобласці Расіі. Як зазначыў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Рэспублікі Беларусь генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ, які камандаваў вучэннем ад нашага боку, гэта быў заключны этап двухгадовага цыклу сумеснай падрыхтоўкі ўзброеных сіл дзвюх краін.**



Яно мае планавы характар і праводзіцца раз на два гады па чарзе на тэрыторыі кожнай з краін. Задума вучэння распрацавана з улікам аналізу магчымых варыянтаў узнікнення ваеннай пагрозы Саюзнай дзяржаве і разгортвання ваеннага канфлікту. Практыка паказвае, што канфлікт пачынаецца з дзеянняў тэрарыстаў, сепаратыстаў, іншых незаконных узброеных фарміраванняў. Іх падтрымліваюць трэція сілы. Гэты варыянт і быў адпрацаваны падчас вучэння. У ім было задзейнічана каля 12 тысяч вайскоўцаў, да 950 адзінак тэхнікі і каля 70 самалётаў і верталётаў. Пра гэта Расія загадзя паведаміла дзяржавам — удзельніцам АБСЕ згодна з нормамі Венскага дакумента 2011 года.

## ЭТАП ПЕРШЫ

На першым этапе вучэння адпрацоўваліся пытанні прымянення рэгіянальнай групоўкі войскаў. Злучэнні і воінскія часці непасрэдна на месцах вырашалі задачы, скіраваныя на недапушчэнне дэстабілізацыі абстаноўкі ў зонах адказнасці. Таксама яны падрыхтаваліся да баявых дзеянняў ва ўмовах нанясення праціўнікам ракетных і артылерыйскіх удараў.

Зладжаная работа розных падраздзяленняў немагчыма без сувязі. Спецыялісты з аб'яднанай групоўкі войскаў разгарнулі каля 35 вузлоў — пунктаў кіравання. Яны былі забяспечаны самымі сучаснымі лічбавымі сродкамі і комплексамі. Больш за трэць з іх было выпушчана сёлета на прадпрыемствах структуры Дзяржкамваенпрама і паступіла ва Узброеныя Сілы. Дзейнічала пяць напрамкаў спадарожнікавай сувязі, больш за 900 кіламетраў радыёрэлейных трапасферных і праводных ліній сувязі. Па легендзе, сілы спецыяльных аперацый мусілі вызваліць ад незаконных вайсковых фарміраванняў захоплены імі населены пункт.

Пасля таго як батальённая тактычная група са сродкамі ўзмацнення 19-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады ўначы заняла першы рубеж манеўранай абароны, у перадавой паласе пачаўся абарончы бой з умоўным праціўнікам. Артылерыйскія падраздзяленні 120-й і 19-й асобных механізаваных брыгад у складзе дзвюх батарэй і мінамётнага ўзвода абстралялі камандныя пункты, жывую сілу і тэхніку ворага, не дазволіўшы яму замацавацца на занятых рубяжах.

Звяно нашых штурмавікоў Су-25 нанесла ўдар па танкавым падраздзяленні на маршы. Лічыцца, што такая наземная цэль — адна з самых складаных для паражэння. Зроблена гэта было ў максімальна неспрыяльных умовах — у абстаноўцы перашкод у рабоце спадарожнікавай сістэмы навігацыі і пры поўнай адсутнасці светлавых арыенціраў на зямлі. Лётчыкі выкарыстоўвалі 250-кілаграмовыя авіяцыйныя бомбы і некіравальныя ракеты розных тыпаў.

Вялікая роля была адведзена дэсанту. Парашутна-дэсантны батальён 103-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады выконваў разведвальна-баявыя дзеянні ў прызначаным раёне. Вайскоўцы здзейснілі марш у складаных умовах, паспяхова знішчылі аб'ект умоўнага праціўніка, пераадолелі ўчастак воднай перашкоды і вызвалілі заручнікаў у гарадзе.

Пасля паветраны дэсант быў высаджаны з верталётаў Мі-8 МТВ-5 на будынкі пры дапамозе як парашутаў, так і альпінісцкага рыштунку. Авіяцыйнае прыкрыццё і агнявую падтрымку іншых падраздзяленняў ажыццяўлялі экіпажы пары верталётаў Мі-24. Яны нанеслі ўдар некіравальнымі авіяцыйнымі ракетамі, а таксама стралкова-гарматным узбраеннем па ўмацаваных пазіцыях ворага.

Група беларускіх спецназаўцаў нейтралізавала ахову праціўніка. Дзякуючы гэтаму былі створаны ўмовы для штурму гарадскіх кварталаў галоўнымі сіламі парашутна-дэсантнага батальёна 103-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады. Група батальёна зачысціла захоплены горад ад баевікоў. Пад кантроль быў узяты кожны дом. Пасля горад пачаў рыхтавацца да кругавой абароны. Гэтую задачу выканаў асобны парашутна-дэсантны батальён віцебскай брыгады нашых Узброеных Сіл. На подступах да горада была створана сістэма інжынерных загарод і засад. Дзякуючы ёй праціўнік не меў магчымасці абысці ачаг супраціўлення. У будынках і падвалах разгарнуліся пункты для камандавання і назірання, харчавання, медыцынскай дапамогі і псіхалагічнай разгрузкі, а таксама склад боепрыпасаў і рамонтныя падраздзяленні батальёна.



Нашы дэсантнікі атакавалі ўмоўнага непрыяцеля, які паспрабаваў адбіць вызвалены напярэдадні горад ад незаконных узброеных фарміраванняў. Адбылося гэта дзякуючы падтрымцы агню артылерыі, супрацьтанкавых ракетных комплексаў і зенітных установак. Каб кантраляваць дакладнасць артылерыйскіх удараў, быў задзейнічаны беспілотны авіяцыйны комплекс «Суперкам С-350».

## ЭТАП ДРУГІ

Па легендзе, падчас другога этапу ў наступленне перайшлі галоўныя сілы сухапутнай групоўкі ўмоўнага праціўніка. Ім супрацьстаялі падраздзяленні 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады. Пры дапа-

Профі

# УЛАДАРЫ ПАВЕТРА



**На Армейскіх гульнях, якія праходзілі ў жніўні, нашы ваенныя лётчыкі выйгралі «бронзу» ў конкурсе «Авіядартс» у агульнакамандным заліку. Саступілі яны толькі Расіі і Кітаю. Але калі ўлічыць магчымасці гэтых дзвюх краін, то трэцяе прызавое месца выглядае цалкам ганаровым.**

На чале зорнага разліку, які прывёз медаль з аэрадрома Дубровічы, што пад Разанню, стаяў **маёр Дзмітрый ЖЭБРАЎ, намеснік камандзіра верталётнага атрада верталётнай эскадрыллі.** Яму дапамагалі штурман капітан Аркадзь Смаляк і бартавы тэхнік капітан Яўген Пятроў. Эскадрылля дыслакуецца на тэрыторыі 50-й змешанай авіяцыйнай базы ў пасёлку Мачулішчы. Туды і адправіліся карэспандэнты «Звязды».

Дзмітрый Жэбраў сустракае нас каля сваёй машыны — гэта верталёт МІ-8 МТВ-5. Афіцэр налятаў ужо больш за 1150 гадзін на ўсіх тыпах верталётаў, якія ёсць у нашых ваенных авіятараў. І прыняў удзел у вучэннях «Шчыт Саюза—2019».

— МІ-8 МТВ-5 — гэта фактычна мадэрнізаваная мадэль вядомага ўсім МІ-8. Тут устаноўлена новае пілатажнае, навігацыйнае абсталяванне... Але добрая авіёніка — гэта толькі частка справы. Асноўны цяжар кладзецца на зладжанасць работы экіпажа. Падчас спаборніцтваў усе рухі пілота павінны быць адточаны да аўтаматызму, каб своечасова ўключаць і пераключаць патрэбныя аўтаматы. Самі разумееце, часу на тое, каб разглядваць прыборную панэль, амаль няма.

Сёлетні «Авіядартс» стаў адным з самых відовішчных і гарачых па напале эмоцый спаборніцтваў. Залік праводзіўся па сямі намінацыях. Нашы ваенныя лётчыкі ўдзельнічалі ў трох. «Штурмавая авіяцыя» здабывала прызы на вучэбна-баявых самалётах Як-130, а ў намінацыях «Армейская авіяцыя на баявых верталётах» і «Армейская авіяцыя на транспартна-баявых верталётах» нашу каманду ўзмацнілі лётчыкі на верталётах Мі-24 і Мі-8 МТВ-5 адпаведна. І з самага пачатку конкурсу нашы авіятары занялі прызавыя месцы ў турнірнай табліцы. Штурмавікі паказалі трэці вынік у сваёй намінацыі, экіпажы на Мі-24 аказаліся другімі, а вось разлік транспартна-баявых верталётаў пад камандаваннем Дзмітрыя Жэбрава стаў найлепшым.

— У «Армейскіх гульнях» мы ўдзельнічалі ўжо другі раз. Летась нам крыху не хапіла да перамогі. Таму была пастаўлена задача сёлета перамагчы. І тым жа складам мы занялі першае месца. Асабліва гэта важна таму, што мы абышлі расіян, — як вядома, яны маюць досвед баявога выкарыстання авіятэхнікі.

Што ж менавіта рабілі нашы лётчыкі на МІ-8 МТВ-5?

— Усё пачалося з фізічнай падрыхтоўкі, — працягвае Дзмітрый Жэбраў. — Яна ўключала ў сябе абароты на стацыянарным коле, плаванне, падцягванне і баскетбольны тэст. Яе змяніла паветраная навігацыя. На нашым маршруце была ўсталявана зона пошуку, дзе за абмежаваны час трэба было знайсці пяць цэляў і максімальна дакладна вызначыць іх каардынаты. За навігацыяй ішоў пілатаж. Складанасць у тым, што ён выконваўся парай верталётаў — вядучым і вядзёным. Таму суддзі ацэньвалі плаўнасць і скаардынаванасць

